■ «Казённае» дзяцінства

ЦАЦКІ І ЦУКЕРКІ МАМУ НЕ ЗАМЕНЯЦЬ

Карэспандэнт «Звязды» пабываў у віцебскім дзіцячым доме. Дзяржава ўзяла на сябе клопат аб больш як 70 дзяўчынках і хлопчыках ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў практычна з усіх раёнаў Віцебскай вобласці. З іх толькі адзін выхаванец — сірата. У астатніх ёсць бацькі, сваякі. Але, відаць, ім дзеці не патрэбны. А каму яны патрэбны, акрамя дзяржавы?

Журналістаў цяжка чым здзівіць, тым больш давесці да слёз, а тут... Яны наварочваліся ў мяне — дзядзькі, якому пайшоў ужо пяты дзясятак, калі дзеткі спявалі песню пра маму. Пра тое, што яна — самы лепшы, самы надзейны сябар. І гэта — пра мам, якім гарэлка і гулянкі даражэй, чым родная крывінка? І цяпер, калі ўспамінаю твары малых, робіцца сорамна і за тых, хто ад іх адмовіўся, і за сябе — бо не хапае смеласці ўзяць кагосьці з іх на выхаванне.

— Наш дзіцячы дом пачаў працаваць у снежні 1946 года і спачатку меў назву Віцебскі дашкольны дзіцячы дом № 5. Зразумела, тады тут выхоўваліся ў асноўным дзеці, бацькі якіх загінулі на вайне. Пачынаючы з 1972 года сюды перавялі дзяцей дашкольнага ўзросту з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. У 1983-м на гэтым жа месцы ўзвялі новы будынак, — расказвае дырэктар установы Наталля Культэнка.

Педагагічных работнікаў у дзіцячым доме каля 40: выхавальнікі, настаўнікі-дэфектолагі, педагог-псіхолаг, сацыяльны педагог, музычны кіраўнік, інструктар па фізкультуры... А ўсяго супрацоўнікаў менш за 90 чалавек, у тым ліку 5 — у дэкрэтным водпуску. Працаваць тут няпроста яшчэ і таму, што 34 выхаванцы маюць затрымку псіхічнага развіцця, разумовую адсталасць... Хлопчыкаў сярод выхаванцаў больш. Як заўважыла вопытная кіраўніца, у дзіцячым доме такія суадносіны існавалі ва ўсе часы.

У гэтую ўстанову трапляюць малыя з Дома дзіцяці (ва ўзросце 3 гадоў) альбо дзеці з прытулку, якія трапілі ў сацыяльна небяспечнае становішча, а затым былі прызнаныя тымі, хто мае патрэбу ў дзяржаўнай абароне.

Прыклады, калі біялагічныя бацькі бяруцца за розум і атрымліваюць права зноў выхоўваць родных дзяцей, ёсць, але вельмі рэдкія.

— Нядаўна перадалі дваіх малых на выхаванне маме. Яна вярнулася з месцаў пазбаўлення волі, выйшла замуж за жыхара Магілёўскай вобласці і паехала з дзецьмі туды. А сярод нашых навічкоў — брат з сястрой, якіх прывезлі з прытулку. Хлопчык вучыцца ў шостым класе, дзяўчынка — у пятым. Добрыя дзеці, адаптаваныя ў сацыяльным і бытавым плане. Іх бацькі жывыя і здаровыя, толькі любяць выпіць, — адказвае на мае пытанні дырэктар.

Дырэктар дзіцячага дома Наталля КУЛЬТЭНКА.

Выхаванцы школьнага ўзросту вучацца ў віцебскай звычайнай сярэдняй школе № 3, у тым ліку і дзеці з затрымкай псіхафізічнага развіцця — у інтэграваных класах. А малых з разумовай адсталасцю, калі яны дасягнуць школьнага ўзросту, пераводзяць у Бягомльскую дапаможную школу-інтэрнат.

У дзіцячым доме ёсць усё неабходнае для жыцця і развіцця дзяцей. Утульныя спальні, пакоі, сталовая, музычная і спартыўная залы, медыцынскі блок з фізіякабінетам, плавальны басейн, кабінет псіхалагічнай разгрузкі, блок сацыяльна-бытавой адаптацыі, гульнятэка і бібліятэка, «зялёны» і сэнсорны пакоі. Дзейнічае нават тэатральная студыя. Але ж дадому ўсё роўна цягне!

Фотавыстава, арганізаваная для таго, каб знайсці дзецям бацькоў.

Зацікавілі вынікі апытання, якое праводзяць супрацоўнікі дзіцячага дома. На пытанне: «Ці маглі б вы браць дзіця на патранатнае выхаванне?» больш як 100 чалавек (або 37%) адказалі: «Так, без праблем»; «Так, але зраблю гэта з мэтай наступнага ўсынаўлення (удачарэння)» — канстатавалі больш як 24% рэспандэнтаў.

Патранатнае выхаванне — гэта калі дзіця перадаецца ў сям'ю на выхадныя дні і час канікул. Згодна з заканадаўствам, такое выхаванне можа быць выкарыстана ў якасці першай стадыі перад наступным афармленнем апекі ці ўсынаўлення або з мэтай пазнаёміць дзіця з паняццем «жыць у сям'і». З ахвотнымі заключаецца дагавор на 1 год. Пры гэтым патранатны выхавальнік павінен мець на руках заключэнне аб наяўнасці ўмоў, неабходных для выхавання дзяцей. Такое заключэнне выдае ўпраўленне або аддзел адукацыі па месцы жыхарства кандыдата.

У прыёмнай сям'і адзін ці абое з бацькоў надзелены паўнамоцтвамі апекуноў дзіцяці аж да яго паўналецця. За дзіцем захоўваюцца льготы, звязаныя з яго статусам сіраты. Адзін з бацькоў заключае працоўны дагавор з органамі апекі па месцы знаходжання дзіцяці і атрымлівае зарплату за яго выхаванне. Дзяржава выплачвае дапамогу на ўтрыманне дзіцяці аж да яго паўналецця...

Апякун мае практычна ўсе правы бацькі ў пытаннях выхавання, навучання, утрымання дзіцяці і нясе поўную адказнасць за дзіця. Аднак фармальна правы апекуна адрозніваюцца ад бацькоўскіх: біялагічныя бацькі маюць права наведваць дзіця, падапечнае дзіця можа быць усыноўлена трэцімі асобамі альбо вернута бацькам. Апякун не мае права прысвоіць дзіцяці сваё прозвішча, памяняць імя, імя па бацьку, дату і месца нараджэння. Праца апекуна не аплачваецца, аднак ён атрымлівае штомесячныя выплаты на ўтрыманне дзіцяці. Пры неабходнасці, па дасягненні выхаванцам 18-гадовага ўзросту, яму выдзяляецца жыллё. Органы апекі рэгулярна кантралююць умовы ўтрымання, выхавання і адукацыі дзіцяці.

Сям'і, якая афармляе ўсынаўленне, дзяржава аказвае такую ж сацыяльную дапамогу, як і звычайнай сям'і, дзе выхоўваюць дзіця.

Супрацоўнікі дзіцячага дома навучыліся праводзіць цікавыя рэкламныя кампаніі. У ліку іншага арганізуюць дні адчыненых дзвярэй, наладзілі ўзаемадзеянне з грамадскімі арганізацыямі па пытанні ўладкавання сірот у сем'і.

Нядаўна ў віцебскай выставачнай зале «Музычная гасцёўня» прайшла фотавыстава «Беларусь без сірот», на якой былі прадстаўлены фотаздымкі выхаванцаў, якія чакаюць сваіх маму і тату. Напрыканцы лета — на пачатку восені тая ж выстава была арганізавана ў Мінску — у кінатэатры «Цэнтральны». Здымкі дзяцей перыядычна з'яўляюцца на вулічных выставах у Віцебску.

— І хай знойдуцца бацькі ўсяго толькі для аднаго дзіцяці — ужо добра! Выставы праводзім у першую чаргу для таго, каб даць дзецям шанц знайсці сям'ю. Яшчэ адна мэта — прыцягнуць увагу грамадскасці да праблем сіроцтва. Дзеці адразу адчуваюць, калі вы цягнецеся да іх. Дзякуючы апецы і абароне, якія можа даць толькі сям'я, дзіця літаральна ажывае, нібы кветка пасля доўгай зімы, часам пачынае нават апярэджваць у развіцці сваіх «хатніх» аднагодкаў. І не бойцеся, што, узяўшы малога «пад сваё крыло», можаце зрабіць яму горш. Наадварот — пакажаце свет са светлага боку, пазбавіўшы дзіця ад страхаў, станеце яму апорай на ўсё астатняе жыццё, — вельмі эмацыянальна расказвае дырэктар.

У тым, як дзеці цягнуцца да незнаёмых дарослых, аўтар гэтых радкоў упэўніўся падчас наведвання ўстановы казахскімі гасцямі, у рамках першага афіцыйнага візіту пасла Казахстана на Віцебшчыну. Ергалі Булягенаў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь, звяртаючыся да дзяцей, сказаў: «Мы прывезлі вам у падарунак тэлевізар з прыстаўкай, кнігі, фільмы, дыскі — усё гэта для вас, каб вы адчулі, што далёкі Казахстан становіцца для вас бліжэй».

А жонка пасла, Шарыпа Булягенава, якая ў Мінску ўзначальвае міжнародны клуб жонак дыпламатаў, пажадала хлопчыкам і дзяўчынкам моцнага здароўя.

Добра, што ўстанове дапамагаюць многія. Толькі сёлета памер спонсарскага ўнёску дасягнуў 300 мільёнаў.

— Гэта не толькі грошы, а і цацкі, мэбля, адзенне, абутак, канцылярскія прылады і іншае — дапамога значная. Мы вельмі ўдзячныя прафсаюзным арганізацыям віцебскіх прадпрыемстваў — яшчэ ніводная пярвічка не адмовіла ў дапамозе. Актыўна супрацоўнічаем з «Белай Руссю», БРСМ. У прыватнасці, валанцёры з моладзевага грамадскага аб'яднання дапамагаюць нам арганізоўваць экскурсіі ў заапарк, у лес і гэтак далей, — дзякуе за падтрымку дырэктар.

Але ж, на жаль, ніводзін дзіцячы дом у самай багатай дзяржаве не ў стане даць дзіцяці таго, што могуць даць толькі бацькі — любоў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара і з архіва дзіцячага дома

■ Кнігарня

КОЖНАЯ ВЁСКА — АСОБНАЯ АПОВЕСЦЬ

Убачыў свет трэці нумар краязнаўчага альманаха Брэсцкага раёна «Астрамечаўскі рукапіс». Па традыцыі часопіс публікуе нотную партытуру музычных твораў з гістарычнага рукапісу. У раздзеле «Астрамечава і астрамечаўцы» можна пазнаёміцца з «Вянком Казіміру Лышчынскаму», які склаў краязнаўца з Лышчыц Міхаіл Мартынчук, а таксама рэдкай кнігай з астрамечаўскай бібліятэкі.

Сапраўдны россып жамчужын фальклору сабралі ўдзельнікі экспедыцыі па вёсках Брэсцкага раёна. Навуковую вандроўку студэнтаў-філолагаў узначаліла доктар філалагічных навук, прафесар Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пушкіна Іна Швед. Яна ж апублікавала артыкул «Каляды на Прыбужжы». А песні, прыпеўкі на мясцовай гаворцы, прыкметы, прымаўкі і прыказкі, запісаныя ў ходзе паездак, успаміны старэйшых жыхароў Лышчыцкага і Матыкальскага сельсаветаў склалі цэлы раздзел альманаха.

Гісторыка-краязнаўчая тэма працягваецца ў рубрыках «Скарбніца народных талентаў» і «Старонкі гісторыі». Чытач даведаецца пра гісторыю вёскі Страдзеч і тутэйшы храм святой Сафіі. Друкуюцца здымкі з сямейных альбомаў і цікавыя гісторыі да іх.

У пажаданні часопісу пісьменніка Уладзіміра Ліпскага чытаем: «Кожная вёска — гэта асобная аповесць. Кожная хата — гэта свой непаўторны раман. І кожны чалавек, яго лёс, прозвішча, характар — асобная старонка ў агульнай гісторыі нашай Айчыны. І калі нават ужо няма паселішча на карце, то ўсё роўна трэба вярнуць яго гістарычную памяць. Дзеля тых, хто там жыў, дзеля тых, хто жыве сёння».

Для гэтага і быў створаны, па сутнасці, першы ў рэспубліцы раённы краязнаўчы альманах. Не змаглі абмінуць аўтары трэцяга нумара і культурныя падзеі апошняга часу. На старонках знайшлося месца фотарэпартажам з першага касцюмаванага балю ў доме-музеі Нямцэвічаў у Скоках, іншых відовішчных мерапрыемстваў.

Святлана ЯСКЕВІЧ

Даты | Падзеі | Людзі

Сусветны дзень людзей, якія пакутуюць ад заікання. Праводзіцца з 2002 года па ініцыятыве канадскіх спецыялістаў па даследаванні паталогій мовы.

1805 год — ля мыса Трафальгар, каля іспанскага порта Кадыс, англійская эскадра адмірала Гарацыя Нэльсана дагнала франка-іспанскую эскадру пад камандаваннем П'ера-Шарля дэ Вільнёва. Марскі бой, які завязаўся паміж эскадрамі, увайшоў у чацвёрку найбуйнейшых марскіх бітваў сусветнай гісторыі. Нельсан бітву выйграў, і Брытанія засталася кіраваць марамі, сур'ёзна ўскладніўшы сувязь Францыі з яе калоніямі. Але гэта была радасць са слязамі на вачах: Нэльсан быў смяротна паранены. У бочцы з каньяком яго цела даставілі на радзіму. Флатаводцу Вільнёвуа Трафальгар таксама каштаваў жыцця: адпушчаны з палону пад слова гонару, ён скончыў жыццё самагубствам. А брытанскія маракі да гэтага часу носяць на шыі чорны гальштук — гэта жалоба па Гарацыя Нэльсану.

1932 год — нарадзіўся Віктар Пятровіч Стрэльнікаў, беларускі вучоны ў галіне анатоміі чалавека, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі. Аўтар навуковых прац па пытаннях нармальнай анатоміі чалавека.

1933 год — сёння споўнілася б 80 гадоў Ігару Міхайлавічу Дабралюбаву, кінарэжысёру, заслужанаму дзеячу мастацтваў Беларусі, народнаму артысту Беларусі (1985). У 1962-96 гадах працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм». Паставіў фільмы: «Іван Макаравіч», «Белыя росы», «Плач перапёлкі» і іншыя. Здымаўся ў кінафільмах «Дзевяць дзён аднаго года», «Каханая». Яго творчасці ўласцівы актыўная аўтарская пазіцыя, актуальнасць праблематыкі, рэалістычная форма. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1970), прызоў міжнародных кінафестываляў. Памёр у 2010 годзе.

Было сказана

Язэп Драздовіч, мастак, скульптар, педагог:

«Не кланяйся і не пагарджай».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Брыг. Фрэгат. Рагу. Отс. Кадра. Шхуна. Цырк. Корта. Яга. Рэрых. Навігатар. Апа. Вар. Атам. Пранажа. Адвана. Смута. Кітай. Рэкітар. Анак. Опт. Атара. Фрак. Прадпом. Зюзя. Прасняк. Чарэшня. **Па вертыкалі:** Брытаніцка. Рані. Аграда. Ада. Пано. Ртаран. Прыпас. Антар. Жарт. Гора. Адама. Фразза. Алоэ. Кір. Люк. Фагот. Абоз. Сэр. Бэрк. Мяч. Шарада. Тамат. Ўпраава. Ула. Аматар. Бурыба. Хор. Акадэмія.

■ Факт

ЛЕПШАЯ ДЫЯГНОСТЫКА АЎТО — У БРЭСЦЕ

Лепшай дыягнастычнай станцыяй па правядзенні дзяржаўнага тэхнічнага агляду транспартных сродкаў сёлета прызнана дыягнастычная станцыя № 200 УП «Белтэхагляд» з Брэста.

Званне лаўрэата агляду-конкурсу, які праводзіўся на працягу пяці месяцаў па ўсёй краіне, атрымала дыягнастычная станцыя № 208 Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. Названы конкурс праходзіць у Беларусі з 2007 года. Сёлета ў ім брала ўдзел 191 дыягнастычная станцыя, або 86 працэнтаў ад агульнай колькасці.

Сяргей РАСОЛЬКА

СЁННЯ

Месяц

Поўня 19 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Афанасіі, Абрама, Канстанціна, Максіма, Пятра, Якава.*
К. *Лідзіі, Саламеі, Аляксандра, Марка, Філіпа.*

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	7.51	17.57	10.06
Віцебск	7.43	17.44	10.01
Магілёў	7.41	17.47	10.06
Гомель	7.34	17.47	10.13
Гродна	8.05	18.12	10.07
Брэст	8.02	18.16	10.14

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

У кардыяхірурга.

— Вам тэрмінова трэба рабіць аперацыю!

— Доктар, а ці нельга адкласці? Я паўгода чакаў чаргу на пратэзаванне зубоў!

Урач задумаўся. Прайшла хвіліна, дзве, пяць...

— Доктар, ну чаму вы маўчыце?!

— Уяўляю: граюць Шапэна, усе плачуць, а вы ляжыце ў труне з прыгожымі, роўнымі, асляпляльна белымі зубамі!

— У цябе як з Наташкай?
— Добра. А ў цябе?
— Таксама добра.

Студэнт — гэта калі па паху адрозніваеш, з якім смакам у суседзяў «Ролтан».

carcatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 23.185. Індэкс 63850. Зак. № 4595.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 кастрычніка 2013 года.